# СВЯТА ЖЫЦЦЯ

## «МЫ РАЗУМЕЕМ, ЯКАЯ БЫЛА ЗАПЛАЧАНА ЦАНА»

### Міншчына ўшанавала герояў каля Кургана Славы



Фота Данііла ХМЯЛЬНІЦКАГА.

**Беларусы з усіх куткоў нашай краіны прыехалі сюды, каб аддаць даніну памяці воінам-вызваліцелям, якія заплацілі за нашу свабоду самае каштоўнае — свае жыцці, — для таго, каб кожны з нас мог атрымліваць асалоду ад мірнага неба над галавой.**

«На мой погляд, 9 Мая — гэта адно з самых важных і эмацыянальных свят, — падзяліўся з журналістамі **старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр ТУРЧЫН.** — Нездарма ўспамінаюца словы з песні «Гэта свята са слязамі на вачах». З аднаго боку, гэта сапраўды вялікая радасць, таму што мы адзначаем вызваленне нашай Радзімы. З іншага — гэта слёзы, таму што мы разумеем, якой цаной нам дасталася гэтая Перамога».

Губернатар расказаў, як Дзень Перамогі суправаджае ўсё яго жыццё. «Я ўспамінаю сваё дзяцінства, калі былі яшчэ жывыя бабулі і дзядулі, яны распавядалі пра тую страшную вайну. Мае бацькі нарадзіліся адразу пасля вайны і памяталі пра аднаўленне нашай Радзімы. Гэтае свята — адно з галоўных для беларусаў, і я ўпэўнены, што яно важнае не толькі для тых, хто нарадзіўся ў Савецкім Саюзе. Перакананы, што гэтае свята заўсёды будзе адным з галоўных і для моладзі, таму што подзвіг нашых дзядоў, прадзедаў, бацькоў немагчыма пераацаніць. Сёння, гледзячы на выдатныя і мірныя абшары нашай краіны, па якіх не ездзяць танкі, дзе не гінуць людзі, ты разумееш і аддаеш даніну пашаны вызваліцелям, якія захавалі для нас нашу Радзіму», — адзначыў ён.

Яркай падзеяй абласнога свята, прысвечанага Дню Вялікай Перамогі, стаў фінал патрыятычнага велапрабегу «Зорка Вялікай Перамогі!», які аб'яднаў сотню ўдзельнікаў з дзевяці куткоў цэнтральнага рэгіёна. Велапрабег стартаваў 2 мая ад Заслаўя і завяршыўся 9 мая тут, каля Кургана Славы. Удзельнікі праехалі 352 незабыўныя кіламетры, перадаючы ад раёна да раёна Сцяг Перамогі.

## ПАДЗЯКА ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ

### У Гродне ўпершыню адбыўся ўрачысты марш нашчадкаў



Фота БелТА.

**Цэнтр горада пачаў напаўняцца людзьмі 9 Мая з самага ранку. На Савецкую плошчу сцякаліся натоўпы адусюль, многія неслі ў руках партрэты сваіх дзядоў і прадзедаў, якія вызвалялі нашу зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гродзенцы такім чынам выказваюць падзяку за іх мужнасць і адвагу.**

Нашчадкі вызваліцеляў у рамках рэспубліканскай акцыі «Белрусь памятае» з партрэтамі і кветкамі прайшлі па цэнтральнай вуліцы Гродна да парку Жылібера, дзе каля брацкай магілы воінам-вызваліцелям гарыць Вечны агонь.

Сёлетні святочны ранак стаў адметным яшчэ і тым, што на пачатку ўрачыстых мерапрыемстваў над горадам стаў развявацца Сцяг Перамогі.

— Гэта дакладная копія таго самага сцяга, які быў узняты байцамі першага Беларускага фронту падчас штурму Берліна над Рэйхстагам. На ім указана дывізія, корпус і трэцяя ўдарная армія, якая разам з іншымі злучэннямі і аб'яднаннямі Чырвонай Арміі ўвайшла ў логава пераможанага ворага, каб узняць над галоўным пунктам Берліна Сцяг Перамогі, — паведаміў **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Юрый КАРАЕЎ,** які прыняў удзел у падняцці сцяга. А развяваецца ён над абласным драмтэатрам — адным з самых знакавых аб'ектаў горада. Дарэчы, такі рытуал у горадзе стаў традыцыйным.

Першымі выказалі ўдзячнасць паўшым воінам ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Яны ўсклалі жывыя кветкі да Вечнага агню, які быў запалены тут роўна 40 гадоў таму. А ўсяго такіх памятных месцаў у краіне 127, з іх 20 агеньчыкаў гараць пастаянна, у тым ліку і гэты, у гродзенскім гарадскім парку.

Упершыню адбыўся ўрачысты марш нашчадкаў. Перад гродзенцамі і гасцямі горада прайшлі з поўнай выпраўкай і цвёрдым крокам выхаванцы і вучні патрыятычных класаў, у іх ліку прадстаўнікі ваенна-патрыятычнага клуба «Цыркон» вайсковай часці 5522, навучэнцы гарадскога патрыятычнага цэнтра «Гонар», кадэты абласнога вучылішча, студэнты ваеннага факультэта ГрДУ. Сваю ваенную выпраўку і дэфіле прадэманстравалі ваеннаслужачыя войск Заходняга аператыўнага камандавання.

Дзень 9 Мая аб'ядноўвае людзей усіх пакаленняў, гэта сімвал згуртаванасці нашага народа, яго мужнасці і адвагі, зазначыў у сваім выступленні **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК.** У той дзень, 79 гадоў таму, здавалася, што настаў вечны мір, эра міласэрднасці і такія пакуты больш не паўтарацца, народы будуць жыць у згодзе паміж сабой. Але сённяшняя сітуацыя сведчыць, што ваеннае мінулае не стала для многіх урокам.

— У заходнім свеце зноў набіраюць папулярнасць ідэі рэваншызму, людзей пачалі дзяліць на правільных і няправільных. Нацызм, які адраджаецца, шукае сваіх новых ідэйных паслядоўнікаў. Зноў гінуць людзі і знішчаюцца гарады і вёскі, няма спакою і каля нашых граніц. Але беларускі народ памятае ўрокі гісторыі і не дазволіць нікому дыктаваць сваю волю. Не дапусціць, каб хтосьці сеяў смерць і разбурэнне на нашай зямлі, — падкрэсліў Уладзімір Каранік.

## «ЗАХАВАЦЬ ПРАЎДУ АБ ПЕРАМОЗЕ»

### Цэнтральнай падзеяй у Магілёве стала шэсце «Беларусь памятае»

**Па вуліцы Першамайскай прайшла ўрачыстая калона, у якой ганаровае месца занялі ветэраны вайны, якіх везлі на машынах. Сярод іх — Міхаіл Цітоў і Андрэй Андрэйчыкаў, франтавікі, пра якіх пісала «Звязда». На пачатку вайны яны яшчэ былі падлеткамі, на фронт трапілі ў 1944-м, іх подзвігі адзначаны баявымі ўзнагародамі.**

— Сённяшні дзень з'яўляецца найвялікшым святам, — адзначыў у размове з журналістамі Міхаіл Цітоў. — Гэта свята, якое мы заваявалі ў найцяжэйшай барацьбе, вызвалілі свет ад фашысцкай пагані. Гэта найвялікшае дасягненне народа Савецкага Саюза. Краіны той ужо няма, але ў маёй душы захавалася ўсё найлепшае, што там было. Ганаруся сваімі баявымі сябрамі, таварышамі. Жадаю ўсім міру, без міру няма жыцця.

Памятае свайго дзядулю-франтавіка Тацццяна Рыбак, якая прыйшла на парад з яго фотаздымкам.

— Мой дзед Іван Шкуранкоў быў артылерыстам, перавозіў гарматы на лінію фронту, — падзялілася жанчына. — У Кёнігсбергу быў сур'ёзна паранены. Але вярнуўся дадому і разам з іншымі адбудоўваў зноў краіну. Усё жыццё насіў у сваім целе асколак, які медыкі не змаглі дастаць у шпіталі. Раней хадзілі на свята разам. Ён, адчуваю, і цяпер побач са мной.

Сустракаць свята прыйшло так шмат людзей, што нават вялікая плошча Славы, дзе адбыўся мітынг, падалася маленькай. Да Вечнага агню ляглі вянкі і кветкі, а ў мірнае неба, такое сонечнае і бязвоблачнае ў гэты ўрачысты дзень, паляцелі паветраныя шары колеру дзяржаўнага сцяга. Паветра скалануў трохразовы ружэйны стрэл, людское мора на хвіліну заціхла ў маўчанні.

— 1418 дзён і начэй вёў барацьбу з ворагам савецкі народ. І як бы не хацеў нехта прынізіць яго ролю ў гэтай барацьбе, нічога ў яго не атрымаецца, — падкрэсліў у сваім выступленні **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** — Шлях да Вялікай Перамогі пракладзены жыццямі мільёнаў людзей. Пра гэта асабліва павінна помніць моладзь. Свята гэта, як пяецца ў вядомай песні, са слязамі на вачах. Яно заваявана крывёю нашых продкаў, цана за яго аддадзена вялікая. Мы павінны быць бязмерна ўдзячныя за мірнае неба, пад якім жывём. На жаль, усё менш становіцца ветэранаў і жывых сведак Перамогі. І перад намі стаіць вялікая адказнасць за захаванне праўды. Трэба быць годнымі подзвігу нашых мужных пераможцаў.

За гады вайны акупанты правялі на тэрыторыі Беларусі больш чым 140 буйных карных аперацый, падчас якіх было спалена больш за 9000 сёл і вёсак, загінулі тысячы мірных жыхароў.

Пасля мітынгу на плошчы адбылася канцэрт «Голас зямлі», у якім прынялі ўдзел народная артыстка Рэспублікі Беларусь Ніна Шарубіна, мастацкія калектывы вобласці.



Фота БелТА.

Святлана ЯСКЕВІЧ, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Маргарыта УШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.